Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 46 (591). Wilnia, Niadziela 9 Śniežnia 1934 h. Hod X (XVIII).

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Для дабра сялянства.

Гэткія і ім падобныя клічы даволі часта спатыкаем у віленскіх польскіх газэтах. Возьмем некульк і прыкладаў.

У „Kur. Wil.“ (з 15.XI с. г.) спатыкаем артыкул: „Praca dla wsi“. Зьмест яго гэткі. Віленская Земляробская Палата, пры супрацоўніцтве дворных паняў, Куратарыюму і Т-ва паддзержаваньня народнага промыслу, у кастрычніку і лістападзе ладзіла курс крою і шыцьця для інструктарак, працуючых на сяле. Але гэтага мала. Такія інструктаркі павінны шмат чаго іншага ведаць. Яны павінны вучыць на сяле гаспадаркі, павінны несьці агульную асьвету, вучыць дабрабыту, гадаваць сяло паграмадзку і г. д. Для гэтай мэты інструктаркі могуць і загаварыць і запяяць пабеларуску і палітоўску, каб здабыць у слухачоў сваіх давер для сябе. Бо вось з гэтым даверам справа стаіць найгорш Сяло агулам, толькі з малымі можа выняткамі, да гэткіх інструктарак адносіцца з поўным недаверам. І дзеля гэтага цэлыя кадры падобных інструктарак і інструктароў профэсыянальнай веды дарэмна сярод сялянства шукаюць працы.

Вось-жа гэтыя адносіны нашага сялянства да сваіх „дабрадзеяў“ цалком зразумелыя і слушныя. Інструктаркі гэныя — гэта неравaжна элемэнт чужы для беларускай вёскі, для беларускай культуры і мовы. Яны ня шчыра працуюць для яе дабра, яны пад плашчам асьветы і дабрабыту для нашага сялянства звычайна зьяўляюцца агенткамі польскага нацыяналізму. Палякі гэткую «асьвету» нясьлі нашаму сялу некалі, ня іншую нясуць і цяпер. Народ гэта добра разумее і затым ад сваіх «дабрадзеяў» староніцца. Сапраўдную асьвету, у розных кірунках, сялянству нашаму можа даць толькі родная беларуская школа і такая-ж асьвета пазашкольная. А як з гэтым у нас ёсьць, — усе добра ведаем.

Узноў-жа ў іншым нумары той-жа «Kur Wil.» (з дня 16.XI. сёл. г.) «рупіцца» аб дабро нашага сяла іншым спосабам. Тут ужо чытаем аб патрэбе для сяла нашага прывілеяў, гэта знача палягчэньняў, бо сяло — гэта галоўная аснова жыцьця гаспадарскага і калі-б сяло належна разьвівалася, дык усе безработныя — работнікі і інтэлігенты — знайшлі-б у ім работу. Але каб так было, дык трэба сялу даць адпаведныя варункі, адпаведныя прывілеі. А найважнейшым гэткім прывілеям, чытаем урэшце ў успомненым нумары «Kur. Wil.», — мае быць вольнае ад аплаты падаткавай радіё. А тады для сяла было-б сапраўды вялікае шчасьце, бо тады б ахвотна паплыла-б на сяло рознага роду інтэлігенцыя, нясучы яму плады асьветы, а бяз радія — дык інтэлігенцыя сяла баіцца...

Гэткія і ншыя «баналюкі» правіць нам нейкі «дабрадзей» наш з «Kur. Wil.» Ня трэба слухаць і радія, каб разумець, што гутарка аб гэткіх „прывілеях“ для нашага сяла — гэта звычайнае пусканьне нашаму сялянству дыму ў вочы. Сялянства наша сапраўды можа асьвяціць і паднесьці яго культурнае палажэньне, як ужо сказана, толькі родная ў розных кірунках асьвета, як школьная, так і пазашкольная; бяз гэтага-ж цяжкое яго цяперашняе палажэньне не паправіцца ані чуточку. Аб гэткай-жа асьвеце паны з «Kur. Wil.» маўчаць, як вады ў губу набраўшы.

Урэшце «Słowo» (з дня 30 XI. сёл. г.) у арт. „Z prac nad przebudową ustroju agrarnego“ падае крыху статыстыкі з польскай палітыкі зямельнай на нашых землях. Статыстыка гэна так-жа вымагае хоць агульных некульк і ўваг нашых.

Даведваемся ад «Słowa», што на тэрыторыі Віленскага ваяводства на 1.4 1934 было схутарызаванай зямлі 320,549 гэктараў для 1408 гаспадарак, гэта знача: 21,4 прац. усей зямлі, патрабуючай хутарызацыі.

Вось-жа гэта хутарызацыя — сама ў сабе сапраўды карысная для нашага сялянства — ідзе, як бачым, жаўлаковым шагам. Не сьпяшыцца, відаць, урад, не сьпяшаць і сяляне. Прычыны гэтага ясныя і пры парцэляцыі сялянскіх зямель на хутары сялянам малазямельным звычайна ня робіцца ніякая прырэзка з дворных, казённых, ці якіх іншых абшараў, ані так-жа перасяляюцца такія гдзе ў іншае месца, на якую запасную зямлю. Дык што паможа хутар нашаму селяніну, які мае 2—3 гэктары?

Урэшце з таго-ж «Słowa» даведваемся, што на нашых землях далей адбываецца асадніцтва цывільнае і вайсковае, а ведаемо-ж добра, якая праводзіцца да нашага сялянства палітыка.

Вось-жа, калі ідзе аб дабро нашага сялянства ў галіне зямельнай, то было-б яно для нас толькі тады, калі-б на нашых землях была праведзена радыкальная, на падставах адзінага і справядлівага закону, згоднага з фактычнымі патрэбамі нашага сялянства, зямельная рэформа. Тымчасам гэтага няма і няведама, калі яно будзе.

Словам, польская праца для дабра нашага сялянства, фактычна ня тэй ідзе дарогай, якой трэба.

Вось чаму астаецца ў сіле наша старая думка, што кожны народ долю сваю сам сабе здабывае і яе будуе. Гэта-ж самае адносіцца і да нашага народу беларускага.

Da čytačoŭ „Biełaruskaj Krynicy“.

HRAMADZIANIE!

„Biełaruskaja Krynica“ wychodzić koštam składak i prychodzić da Was što-tydzień. Składka: u hod 4 zł., na paŭhodu 2 zł. i na try miesiacy 1 zł.

„Biełaruskaja Krynica“ najstarejšaja z pasiarod bieł. sučasnych i najbolš pašyranaja hazeta. Ideja „Bieł. Krynicy“ — dabro Biełaruskaha narodu.

„Biełaruskaja Krynica“ pawinna być u kožnaj biełaruskaj wioscy, miastečku, horadzie i ŭ kožnaj biełaruskaj siamji.

Wydawiectwa „Bieł. Krynicy“ dziela pašyreńnia i pahłybleńnia ŭ biełaruskich narodnych masach nacyjanalnaj, socyjalnaj i palityčnaj świedamaści raspaŭsiudžwaje biełaruskaje drukawanaje słowa (knižki, brašury, žurnały i hazety). Wydawiectwa „Bieł. Krynicy“ zaklikaje Pawažanych Čytačoŭ zaachwočywać swaich susiedziaŭ, swajakoŭ i znajomych wypiswać „Biełaruskuju Krynicu“; zaklikaje ŭsich swaich čytačoŭ abrawić składku na 1935 hod; pierasyłajuć hrošy dałučanym da časopisi razrachunkowym pierakazam, na jakim padany adras: Redakcyja i Administracyja „Biełaruskaja Krynica“, Wilno, ul. Zawalna 1—1, Nr. 21 kartoteki.

Kali chto nia moža da nowaha 1935 hodu prysłać choć najmienšaj składki, niachaj pastarajecca prysłać pa Nowym Hodzie, ale ciapier zakazać sabie „Bieł. Krynicu“ dałučanaj da našaj hazety atkrytkaj.

Pakul wydawiectwa „Bieł. Krynicy“ nie trymaje składki abo zakazu na našuju časopiś „Biełaruskaja Krynica“ wysyłacca nia budzie.

Wydawiectwa „Bieł. Krynicy“ dla swaich čytačoŭ wyznačyła premiju ŭ formie knižak i na 1935 hod.

Chto pryšle da 1 lutaha 1935 h składku:
na cełу hod — 4 zł, toj atrymaje premiju z 3-ch knižak:

1) „ШЛЯХАМ ЖЫЦЬЦЯ“ Я. Купалы,
2) „Z RODNAHA ZAHONU“ Ziaziuli
3) „CYMBAŁY“ W. A.

na paŭhodu — 2 zł, toj atrymaje premiju z 2-ch knižak:

1) „Z RODNAHA ZAHONU“ Ziaziuli,
2) „CYMBAŁY“ W. A.

Chto ŭ hetym terminie nia pryšle ani hrašowaj składki, ani zakazu „Bieł. Krynicy“, tamu hazeta budzie spyniena.

Wydawiectwa „Bieł. Krynica“.

Biełarusaŭ kryŭdziać i miž saboj wadziacca.

Niadaŭna wiedamy daśledčyk ukrainskaj sprawy L. Wasileŭski — miž inšym aŭtor knižki „Litwa i Białoruś“ — napisaŭ nowuju pracu.

U pracy hetaj była źmieščana mapa, na jakoj da ŭkrainskich ziamiel dałučana čaść ziamiel etnohrafična-biełaruskich. Niekatoryja polskija hazety, a ŭ ich liku asabliwa wilenskaje „Słowo“, napali na Wasileŭskaha, što jon pazwoliŭ na mapie dałučyć da ziamiel ukrainskich ziemli zusim nie-ukrainskija. Woś ža cikawa adciemić, što polskija publicysty ŭ swaich napadkach na henu pamyłkowuju mapu ani zaiknucca ab tym, što henyja nie-ukrainskija ziemli — heta ziemli biełaruskija. Ale z publicystych polskich my i nia dziwimsia, jany zaŭsiody hetak da nas adnosiacca. Dziwimsia krychu bolš z polskich „wučonych“ z niejkaha gieografičnaha instytutu pry U.S.B., jakija tak-ža da henaha zdareńnia adnieślisia, jak i publicystyja, jaŭna ŭkrywajučy ab nas praŭdu.

ГРАМАДЗЯНЕ! Усе на ніву культуры! Гдзе няма, — арганізуйце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, а гдзе ўжо заложаныя — узмоцніце ў іх працу!

БЕЛАРУСКАЯ ХРОНІКА.

Судзяць і штрафуюць. У віленскім Гарадзкім Судзе 28 лістапада сёлета разглядаліся справы дзьвюх канфіскат віленскіх беларускіх газэт: „Беларускай Крыніцы“ і „Новага Шляху“. Першай разглядалася справа рэдактара „Новага Шляху,“ грам. Ул. Казлоўскага, якога пракуратура абвінавачвала за артыкул „Не зьмяніліся“, зьмешчаны ў № 2 (4) рэдагаванай ім часопісі. У гэтым артыкуле — паводле слоў пракурора — лішне ярка (przejaskrawiono) было паказана на падабенства паміж палажэньнем няпольскіх народаў у сяньняшняй Польшчы і такім-жа палажэньнем тых самых народаў у Польшчы прад яе падзелам. Абвінавачаны на доказ свайго становішча прыводзіў багаты матарыял з гісторыі (з польскіх школьных падручнікаў) і з сучаснасьці (з легальнай польскай прэсы). Суд, выслухаўшы довадаў пракурора і апошняга слова абвінавачанага, засудзіў гэтага апошняга на 50 зл. штрафу і на 2 тыдні арышту, стрымліваючы(завешваючы“) гэты апошні на 3 гады.

Наступнай разглядалася справа рэдактара „Беларускай Крыніцы „грам. Я. Пазьняка, якога пракуратура абвінавачвала за артыкул „Ніякі саюзьнік, зьмешчаны ў № 28 „Беларускай Крыніцы з дня 25 7.34 Пракуратура ў гэтым артыкуле дашукалася непраўдзівага прадстаўленьня стану асьветы на беларускай вёсцы. Абвінавачаны ў сваё апраўданьне прадставіў Суду доказы (легальную ў Польшчы прэсу) аб паступовым і сыстэматычным ліквідаваньні беларускага школьніцтва пад Польшчай, з 400 школ пачатковых і 6 гімназіяў, — да ніводнай гімназіі і аднэй-адзінай гімназіяльнай філіі. Далей абвінавачаны прадставіў Суду польскую прэсу, якая вольна бароніць правы свайго польскага сялянства на асьвету і даказваў патрэбу і абавязак свой, як рэдактара беларускай газэты, бараніць і дамагацца тых-жа правоў для сялянства беларускага. Пракурор у сваёй прамове дапусьціў магчымасьць, што беларусам можа мясцамі і дзеецца крыўда на ніве асьветнай, але рашуча супроцьставіўся зьместу сконфіскаванага нумару „Беларускай Крыніцы,“ цьвердзячы, што польскі ўрад не падтрымлівае цемнаты, як свайго саюзьніка на беларускай вёсцы!

Суд, па апошнім слове абвінавачанага, засудзіў яго на 80 зл. штрафу і на 2 тыдні арышту, устрымліваючы гэты апошні на 3 гады.

Абодва такім чынам засуджаныя беларускія рэдактары заявілі апэляцыю ад гэтага прысуду ў Суд акружны.

Жалобнае набажэнства. У суботу 1 сьнежня а гадзіне 8 у касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні адбылося за супакой душы праф. Бр. Эпімах Шыпілы жалобнае набажэнства, якое служыў Кс. В. Гадлеўскі.

Скарга ў Бел. Нац. К-т. Гэтымі днямі прыбыла ў Вільню, у Бел. Нац. К-т дэлегацыя з в. Барска, Навагрудзкага пав. і падала скаргу на тамашняе палажэньне сялянства. У справе падзеяў там ад 23 да 28 мін. м. Камітэт падаў скаргу пракурору і ў міністэрства праз Сойм.

„Сьмерць Кастуся Каліноўскага,“ — поэма Міхася Машары, — выйшла з друку асобнай кніжыцай. Вільня, 1934 г. Выданьне Ст. Глякоўскага і Яз. Найдзюка. Цана кніжыцы 25 гр. Купіць можна ў кнігарні „Пагоня“ — Вільня, Завальная 1.

Хроніка „Студэнскай Трыбуны“.

— Чарговы нумар „Ст. Трыбуны“ выйдзе ў студні месяцы 1935г.

— Звальняюць на сьвята студэнтаў віленскага унівэрсытэту: каталікоў — на час ад 15.XI 34 г. да 8.I.35 г., праваслаўных — на час ад 15.XII.34 г. да 15.I 35 г.

— Надзвычайны агульны сход сяброў Бел. Студ. Саюзу ў Вільні адбудзецца дня 9.XII сёлета у залі VI галоўнага будынку У.С.Б. На парадку дзенным сходу: 1) адчыненьне, 2) выбар старшыні сходу, 3) справа спыненых у правох функцыйных двух сяброў Ураду Б.С.С., 4 вольныя прапановы. Уваход на падставе сяброўскіх білетаў. Пачатак а гадз. 15.

— Дня 24 лістапада ў Б.С.С. адбылася традыцыйная сяброўская гарбатка, з учасьцем п. Куратара Б.С.С., праф. Кэшмідэра, і некаторых запрошаных гасьцей. Усіх учасьнікаў было каля 50 асоб. Гарбатка адбылася ў вельмі сардэчнай атмасфэры. Кал. д-р Фр. Грышкевіч, аос. Я. Клагіш расказалі прысутным аб студэнскім жыцьці: першы — аб жыцьці студэнтаў у Празе, другі — у Латвіі. Кал. Урбановіч падаў уражаньні з свайго быцьця ў Рыме.

Гарбатка перапляталася і кончылася гучнымі песьнямі, гульнямі і скокамі.

— Хор гр. Р. Шырмы апошнім часам узмоцніў сваю дзейнасьць. Адбываюцца часта рэпэтыцыі. Хор рыхтуецца да выступленьня на канцэрце, а таксама да выступленьня ў радыё.

Нажаль, учасьце у хоры нашай студэнскай моладзі вельмі малое.

— На тэму „Аб імпэрыялізьме“ дня 1-га сьнежня сёлета ў Б.С.С. прачытаў рэфэрат кал. А. Смаль.

Кажуць, што галава — то й розум. Кожны пасвоему сочыць за праявамі жыцьця і імкнецца знайсьці прычыны гэных праяваў.

—о—

На беларускай ніве, апушчанай, а якжа паросшай чужацкім пустазельлем, патрэбны працаўнікі, патрэбны аргаі, якія-б сваею мазолістаю рукой узаралі гэную ніву і засеялі зерне праўды, — якоеб прынясло буйны ўмалот — дабрабыт і шчасьце гаротніку Беларусу.

—о—

Ці выслухаўшы рэфэрату кал. Смаля, ня можна сьцьвердзіць: 1) што якжа далёка кал прэлегент (і яму падобныя) адышоў ад гэнага мазолістага рабачая Беларуса, 2) і што кал. Смаль самобічаваў сваім недарэчным рэфэратам? — Так, сто разоў так!

Ад шчырага сэрца жадаем яму глыбейшага апанаваньня веды, умысловай самадзейнасьці, і рабіць тое, да чаго паклікаы з увагі на свае здольнасьці і кірунак студыяў (прырода матэматыка!)

— Справа беларускага тэатру у Вільні, як даведываемся, стаіць на добрай дарозе. У папярэднім (12) нумары „Ст. Трыбуны“ кал. Шаў., гаворачы ў сваім артыкуле аб гэтым тэатры, зазначыў, што на адозву гр. Аляхновіча у справе арганізацыі бел. тэатру, адгукнуўся толькі гр. Шыла. Гэткая вестка аб асабовым стане тэатру выклікала з боку віленскіх беларусаў, якія належаць да тэатру, абурэньне. Заяўляем, што кал. Шаў атрымаў выжэй паданую інфармацыю ад самога гр. Аляхновіча — кіраўніка тэатру і дзеля гэтага абурацца няма чаго. Цяпер-жа з прыемнасьцю сьцьвярджаем факт значнага ліку (каля 20 асоб) учасьнікаў і супрацоўнікаў гр. Фр. Аляхновіча ў справе зарганізаваньня беларускага тэатру.

Даведываемся, што тэатр рыхтуецца да пастаноўкі ў Вільні, яшчэ перад Новым годам, наступныя п'ескі: 1) „Птушка шчасьця“ — Фр. Аляхновіча, 2) „У зімовы вечар“ Арэшчыкі.

— На дэмагогічную зацемку „Роднага Краю (№ 25, з дня 24 XI 34) аб вечарыне трох студэнскіх (Беларускага, Літоўскага і Украінскага саюзаў, якая адбылася дня 10 лістапада, адказваем нехаця. — Вечарына адбылася пад знакам заманіфэставаньня еднасьці і лучнасьці трох успомненых студэнскіх саюзаў; студэнтаў з БСС. і абсольвэнтаў беларусаў быў значны лік (больш 20 асоб); іншых беларусаў — не студэнтаў і не абсольвэнтаў было каля 15 асоб. І ўсе Беларусы былі не „па прыказу, як гэта думае аўтар гэнае зацемкі, але з уласнай волі. Аб гэтым ведаюць усе з беларусаў, хто быў на гэнай вечарыне. А можа і бел. гімназіяльная моладзь была на вечарыне „па прыказу? Га?!

— Ультрачырвоная мафія працуе У памешканьні БСС нядаўна быў падкінены правакацыйны брудны, ананімны пашквіль, у якім ягоныя аўторы бэсьцяць усіх тых, хто не стаіць на іх становішчы; бэсьцяць беларускі нацыянальны бел.-чырвона-белы сьцяг, робяць клясавы падзел сярод студэнтаў і інш. нікчэмнасьці.

Сябры Б.С.С.! У імя добрага імя БСС. і беларускага студэнта, павінна дружна даць належны адпор агіднай рабоце!

— Дня 4 га сьнежня Беларускі Студ. Саюз зарганізаваў вечар прысьвячаны памяці свайго сябры, Пятра Пяршукевіча, з прычыны прыпадаючае ў гэты дзень першае гадаўшчыны ягонай сьмерці. Вечар адбыўся ўрачыста.

Сябры БСС. у асобах: старшыні М. Шчорса, М. Мілючанкі, А. Смаля, Я. Давідовіча, Я. Малецкага, Я. Шутовіча — падалі прысутным весткі аб жыцьці і дзейнасьці

Dr. St. Hrynkiewič.

Chwaroby weneryčnyja.

A. Syfilis. Wyklikajecca bakteryjaju, što zawiecca spirocheta pallida. U niekalkinaccać dzion paśla zaražeńnia na tym miescy, dzie spirochety ŭwajšli ŭ cieła (najčaściej na orhanach płočnych), pačynaje rašci biaz nijakaje boli skuła (ćwiordy šankier). Skuła potym adčyniajecca, robicca małaja ranka, jakaja hoicca, kali na't jaje zusim nie lekawać. Da waśmi tydniaŭ paśla hetaha zaražany ničoha nia bačyć, hatoŭ užo zabycca ab usim i śmiajecca nad sobskim stracham i tym, što čuŭ ab henaj chwarobie. Adnak prychodzić wysypka na skury, na sklizistych pawałokach (rot, adchodnaja kiška). U ranach i na miescy wysypki poŭna spirochetaŭ. U hetym peryjadzie chwaroby nadta loh ka zarazicca ad chworaha. Ślina c worych, kali jany majuć ranki ŭ rocie, zaraznaja; zarazicca mož na karystajučysia adnym načyńniem ci adnym ručnikom wycirajučy twar abo ruki.

I henaja wysypka prapadzie z lekami ci biaz lekaŭ Ale z hetym nie kaniec chwaroby. U tym woś i biada z syfilisam. Napałochany chwory kaža, što ŭsieńka zrobić; pahladzieŭšy, što byŭ šankier ćwiordy i prapaŭ, była wysypka i niama jaje — i heta ŭsieńka biaz nijakaha lakarstwa, — biaśpieč na hladzić na budučyniu. A jana daloka nia lohkaja. Niawylečanaja chwaroba wałačecca pakul žyćcia. Prydzie para, mo' za piać, mo' na't i za 10 hadoŭ ani stul ni zsiul poŭna bałačak na ciele, nadta ciažkich karostaŭ, pačynajuć hnić kości, z cieła — adna hnijučaja rana. Mahčymy i inšy abraz — pačynaje wysychać śpinny mozah, čaławiek lažyć jak miašok. — ani rukoju ani nahoju, nia moža strymać u sabie wyparažnieńniaŭ Ni žyć, ni pamirać — sam nia wiedaje, što i rabić, a adnačasna boli pry hetym strašennyja. Nia wiedaju, ci horšaja, ci lepšaja dola chto maje syfilisa mozahu. Nia wiedaje jon, što rabić, dzie idzie, nia maje pamiaci zusim, časta niebiaśpiečny i sabie i blizkim. Roznyja inšyja formy warjactwá mahčymyja pry nialekawanym luesie.

Mała taho, što pakutuje sam chwory Dzieci jahonyja, unuki dy praŭnuki naśledujuć, jak užo ŭspaminaŭ ja, henuju chworaść u samaj roznajakaj formie.

Ab źništažeńniach, jakija robić pranca, napisany šmatlikija i taŭstyja knižki. Dawoli taho, što ja tolki što kazaŭ, kab nabrać „pašany“ da chwaroby. Kožny, chto bačyć padazronnyja ŭ siabie prajawy, chaj čym chutčej idzie da doktara. Daktary majuć swaje sposaby, kab dobra paznać henuju chwarobu.

Lačeńnie syfilisu doŭha trywaje. Nia treba wieryć tym znacharom, ci jany swaje susiedzi, ci pa dalokich miestach siadziać, što ad syfilisu možna wylačycca toju ci inšaju maściaju ci kroplami. Toj, chto tak raskazwaje, abo nia wiedaje ničoha, abo choča wam paškodzić, kab chwaroba zaciahnułasia, abo choča na chwarobie zarabić.

Nia wier tady durnomu ci škodnamu čaławieku i idzi da doktara, kab pahladzieŭ, ci maješ syfilisa, a kali maješ, kab lačyŭ ciabie. Pomni ab niebiaśpiekach tabie pahražajučych!

B. Tryper. Bolš raspaŭsiudžanaja chwaroba, jak syfilis. Dawoli skazać, što pa miestach amal nia kožny mužčyna da 30-ci hadoŭ mieŭ adzin abo i bolš razoŭ trypra. Da trypra prywykajuć, durnaja maładziaž amal nie hanarycca henaju chwarobaju. Tyja z maładziejšych, što słužyli ŭ armii, wiedajuć, jakija mała pawažnyja, nia hledziačy na ŭsieńka, adnosiny da trypra. I zusim nia słušna. Z tryppram treba być nadta aściarožnym.

Hlaniem nasampierš, jak prachodzić henaja chwaroba. Wyklikajecca bakteryjami trypra. Paśla zaražeńnia ŭ 2—3 dni pajaŭlajucca boli ŭ močachodzie, boli henyja najbolšyja, kali adchodzić mača. Adzi druhi dzień i z mačachodu pačynaje ciačy materyja. Płoć mužčynskaja ci žanockaja bryniaje. Dawoli časta padchaplajecca haračka. Ciažka strymać maču, a znoŭ addajučy maču — wialikija boli.

U žančyn chworaść moža abmiažawacca ŭpławami Upławy henyja abo zielankawatyja, abo krywawa-zielankawatyja. Mała jašče hetaha, bakteryi mohuć u žančyn ajšci ŭ matku i stul da jaječnikaŭ. Heta miž inšym adna z nadta častych pryčynaŭ biaździetnaści i roznajakich bolaŭ „usiaredzinie“, „na kryžawinie“ i h. d.

Małyja dzieci zaražajucca ad maciery, splučy ŭ adnym łožku. I jak heta bywaje — najmienš winawaty najbolš cierpić, małyja dzieci pieranosiać bakteryi z materyjaju na wočy. Pawieki čyrwaniejuć, bryniajuć, chwaroba zaciahwajecca i kančajecca nia redka ślepatoju. Asabliwa časta ślepata traplajecca ŭ dziaciej pry rodach kali baćka abo maci chworyja na trypra. A tak lohka adratawać ad žudasnaha kalectwa, dajučy paru kroplaŭ lakarstwa (protarhol)

C. Miakki šankier (bubony). Najmienš raspaŭsiudžanaja weneryčnaja chwaroba, zatoje najbolš pry joj bolaŭ. Wyklikajecca pałačkami miakkaha šankra. U dwa-try dni paśla zaražeńnia na orhanach płočnych možna bačyć ranku. Pobač z rankaju bryniajuć załozy pachwinnyja. Nabryniaŭšyja załozy mocna balać. Dawoli časta pačynajuć jany hnić.

Woś byŭ karotki ahlad chwarobaŭ weneryčnych i ichnaje škodnaści. Kožnamu, chto ŭmieje dumać, nakidwajucca zornyja dumki, wywady ŭ suwiazi z henymi chwarobami.

Lekawańnie i syfilisu i trypra i šankra miakkaha (bubonaŭ) nadta doŭhaje, darahoje. Lepš tady ad ich aścierahacca. Jak najlepš ich ścierahčysia?

Žyć skromna, moralna i paŭstrymliwa z boku płočnaha. Kažuć, što paŭstrymliwaść maje być škodnaju dziela zdaroŭja. Heta iłža!

Nikomu ani mužčynie, ani žančynie paŭstrymliwaść nia škodzić na zdaroŭje, za toje nadta škodnyja, jak my bačyli, na zdaroŭje weneryčnyja chwaroby

Nia spać u adnym łožku, ci na adnym pałku z čužymi ludźmi ci ahułam z ludźmi, jakija majuć karosty, wysypku, padazronyja badziulki na skury.

Nie karystacca adnym načyńniem niekalki asobam.

Chaj kožny maje sobski ručnik i nasoŭku.

Chaj žančyny nia kormiać čužych dziaciej z padazronaju wysypkaju swaimi hrudźmi.

Kali maješ wysypku abo padazronuju karostu, idzi chutčej da doktara, kab zabiaśpiečycca ad ciažkaje chwaroby.

П. Паршукевіча, падкрэсьлілі ягоныя заслугі для бел. народу, і заклікалі сяброў ісьці шляхам Паршукевіча, шляхам беларускага пазытывізму, шляхам упорнай, ахвярнай і арганічнай працы. На гэтым скончылася першая частка праграмы вечару. Другую частку выпаўніла чытаньне некаторымі сябрамі БСС. 5-га акту драмы Я Хвораста, прысьвячанага так-жа Паршукевічу. Гэтая 2 я частка праграмы вышла ня зусім удачна, дзякуючы кепскаму „адыграньню“ нікаторых фрагмэнтаў гэтага акту.

Агулам кажучы, БСС. зусім дастойна аддаў чэсьць свайму сябры.

Zlitoŭskich balačak.

Adstaŭka dyrektara Litoŭskaj himnazii ŭ Świancianach. Litoŭskija hazety pišuć, što polskija školnyja ŭłady hram. Petrajtisu zabaranili dalej astawacca dyrektaram u Lit. Świancianskaj himnazii za toje, što padčas himnazijalnych uračystaściaŭ wučni nie piajali polskaha dziaržaŭnaha hymnu. Adnačasna henyja ŭłady prapanujuć lit. T-wu „Rytas“, kab pradstawiła kandydata na nowaha dyrektara.

Litoŭskija hazety, z wiedamych pryčyn, padajuć sam hety zahad polskich školnych uładaŭ i ad syebie jaho wyjaśnieńnia ŭstrymliwajucca, tolki zaznačajučy, što ŭ polskim dziaržaŭnym hymnie jość słowy: „Przej dziem Wartę, przejdziem Wisłę, będziem polakami“...

Zahadali wobak mowy litoŭskaj užywać polskuju. Litoŭskaja himnazija ŭ Świancianach atrymała zahad Wilenskaha Školnaha Kuratara kab pratakoły pasiedžańniaŭ pedahohičnaje rady, raskład nawukowaha materjału i inš. wialisia i palitoŭsku i papolsku.

„Viln. Ryt.“ (Nr. 95) padajučy heta ćwierdzić, što hetki zahad Kuratara supiarečny z „jazykowymi zakonami“ i z niekatorymi rasparadžeńniami Ministra Aświety i što zahad heny apirajecca chiba tolki na tym, što prysyłanaja kolki miesiacaŭ tamu z Kuratoryjumu ŭ Lit. Świancianskuju Himnaziju wizytatarka, a tak-ža prysłanyja dwa wučyciali nia znajuć litoŭskaj mowy. — Praŭda, kaža ŭreście „Viln. Rytojus“, takoha zakonu niama, kab henyja try asoby umieli palitoŭsku, ale tymčasam niama i takoha zakonu, na jakim by Kuratoryjum mahło apiorci swoj zahad.

Kanfiskata „Viln. Žodis“. 30 XI sioł. hodu na padstawie zahadu Starasty na m Wilniu byŭ skanfiskawany Nr.30 litoŭskaj hazety Vilniaus Žodis“ za čaść artykułu „Trahiedyja čaławieka“.

Z.

М. Грушэвськый

У Маскве, куды быў выгнаны з роднага краю, памёр ведамы ў сьвеце ўкраінскі вучоны, праф. Мыхайло Грушэвськый.

М. Грушэвськый найбольшы сучасны ўкраінскі гісторык, б. старшыня Украінскай Цэнтральнай Рады, сябра Украінскай Акадэміі Навук.

М. Грушэвськый працаваў ва ўсіх галінах жыцьця: быў пісьменьнікам, гісторыкам, публіцыстым і палітычным дзеячом. Нябожчык усьцяж прызнаваў патрэбу Украінска-Беларуска Літоўскага саюзу.

Ад 1930 году праф. Грушэвськый прабываў у Маскве, куды яго былі выслаўшы камуністычныя ўлады. Памёр маючы 68 гадоў.

Шмат працярпеў гора ўкраінскі патрыёт— вучоны пад уладай чырвонай Масквы і гэта было прычынаю яго сьмерці.

Дуковая постаць Нябожчыка астанецца на доўгія вякі фундамэнтам для дзяржаўнасьці і славы Украінскага народу.

n.

Sucelny palityčny front Litwy, Łatwii i Estonii.

Hetymi dniami končyłasia h. zw. bałtyckaja konferencyja, jakaja adbywałasia ŭ Estonii i končyłasia ŭstanaŭleńniem sucelnaj palityčnaj linii troch dziaržaŭ: Litwy, Łatwii i Estonii. Kali narady konferencyi končylisia, pradstaŭniki hetych dziaržaŭ wydali supolny kamunikat, u jakim adznačajuć značeńnie supracoŭnictwa troch prybałtyckich dziaržaŭ dziela ŭtrymańnia eŭropejskaha supakoju. Usie try dziaržawy wyjawili swaju prychilnaść da h. zw. uschodniaha paktu, jaki starajecca stwaryć, kala sajuzu hetych troch dziaržaŭ, Francyja. Pastanoŭlena stwaryć supolnuju reprezentacyju troch dziaržaŭ u Lizie Narodaŭ i ŭ inšych mižnarodnych arhanizacyjach.

Palityčnaje zabojstwa kamunistyčnaha dastojnika ŭ SSRR.

U subotu, 1 h.m. u Leninhradzie (Pietrahradzie) u budynku leninhradzkaj rady zabity kamunistyčny dastojnik, Siarhiej Kirow. Zabojca aryštawany.

Kirow byŭ zdaŭnych kamunistym i za časoŭ caryzmu siadzieŭ u wastrohach za rewalucyjnuju akcyju. Paśla rewalucyi byŭ na wysokich stanowiščach u balšawickaj armii i ŭ kamunistyčnaj partyi. Apošnimi časami byŭ hałoŭnym kiraŭnikom Kampartyi Leninhradzkaha wokruhu i siabram centralnaha wykanaŭčaha kamitetu SSRR. Kirow razam z inšymi dziailŭ Biełaruś; byŭ adnym z pasiarod twarcoŭ ryskaha traktatu z boku balšawikoŭ.

Kamunikat kamisarjatu nutran. spraŭ SSRR ćwierdzić, što zabojca Kirowa—heta čynoŭnik leninhradzkaha addziełu rabotnicka sialanskaj inspekcyi, Leanid s. Bazyla Nikołajew, 30 hadoŭ.

Hetaje palityčnaje zabojstwa ŭzwarušyła ŭsich kamunistaŭ u Sawietach. Pierapudžanyja kamunisty damahajucca jašče wastrejšaha teroru suproć swaich ideowych praciŭnikaŭ. Ułady GPU pačali šyrokaje śledztwa i pačałasia žorstkaja rasprawa z padazronymi ŭ nieprychilnaści da kamuny. Užo rastraleli 66 asob.

Ab swabodzie nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polšču i relihii ŭ Sawietach.

U anhielskim parlamancie nadowiačy hawaryli ab swabodzie nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polšču i ab relihijnaj swabodzie ŭ SSRR. Pasły pytalisia ŭ ministra zahraničnych spraŭ: ci prad uwachodam Sawietaŭ u Lihu Narodaŭ była abhaworana sprawa relihijnaj swabody ŭ S.S.R.R. i što dumaje rabić ministr zahraničnych spraŭ u suwiazi z wystupleńniem min. Beka, jaki zajawiŭ, što Polšč nia budzie padlahać mirnamu dahaworu, jaki zabieśpiačaje swabodu nacyjanalnym mienšaściam. Pradstaŭnik zahraničnaj palityki na hetyja pytańni adkazaŭ hetak: ab relihijnaj swabodzie ŭ SSRR u Lizie Narodaŭ nie hawaryli, a ŭ sprawie druhoj — zajawiŭ, što nijakaja dziaržawa nia moža zwolnić siabie adnabokа ad abawiazkaŭ dahaworu, jaki zabieśpiačaje swabodu nacyjanalnym mienšaściam.

Roznyja wiestki.

Z POLŠČY.

Prymusowyja biblijateki. Miž inšymi maje pajawicca ŭ Sojmie i prajekt z konu ab prymusowych publičnych biblijatekach. Pawodle hetaha prajektu miastečki, jakija majuć bolš 2000 žycharoŭ, pawinny mieć samaŭradawyja publičnyja biblijateki.

Kryzys i studentam. Wa ŭsiej Polšču nie zmahli ŭ srok zapłacić za nawuku 700 studentaŭ, jakija abo pierastanuć wučycca, abo zapłaciać, z dabaŭkaj 10 zł.

Cukar padaražeje. U Anhlii polski cukar pradajecca pa 6 hr. za kilo, u Polšču jon kaštuje 1 zł.25 hr. kilo. Urad ciapier zadumaŭ nałažyć nowy nałoh na cukar, — pa 3 zł. 50 hr na 100 kilo. Cukar maje kaštawać 1 zł. 30 hr. kilo.

Z ZAHRANICY.

Skasawali kartački ŭ Sawietach. Balšawiki ŭzialisia refarmawać iznoŭ nanowa swoj nutrany handal. Hetaj reformaj skasawali kartački na chleb i inšyja produkty.

Razhrom kamunistaŭ u Kitaju. U kitajskich prawincyjach kala haradoŭ Fukjen i Kiangs kitajskaja čyrwonaja armija zusim razwaliłasia. Marš. Čan-Kaj Šek wydaŭ kamunikat, što balšawickaja armija ŭ Kitaju ŭžo zusim raźbita.

Japonija damahajecca Władywastoku. Japonski ŭrad pačaŭ adkryta damahacca, kab balšawiki abo pradali, abo i tak addali japoncam Władywastok.

Złučylisia z III, razłučylisia z II. Socyjalisty majuć swoj internacyjanał II, a kamunisty III. Francuskich socyjalistaŭ zatoje, što stwaryli z kamunistami „supolny front“, wyklučyli z II internacyjanału.

Niamieckaj zbrajeńnie niepakoić Francyju. U francuskim parlamancie referent wajennaha biudžetu damahajučysia padwyžki raschodaŭ na francuskaje zbrajeńnie, swajo damahańnie matywawaŭ zbrajeńniem Niamieččyny. Jon ćwierdziŭ, što ŭ 1935 hodzie Niamieččyna budzie mieć 5 z paławinaj miljonnuju dobra azbrojenuju armiju i 4000 latunoŭ.

Adbirajuć prawy Katalonii. U apošniaj hišpanskaj rewalucyju, jakuju ŭrad krywawa zdušyŭ, Katalonija chacieła całkom addzialicca ad Hišpanii. Adnak heta joj nie ŭdałosia. Hišpanski ŭrad krywawa zdušyŭ paŭstancaŭ. Pryčynaj niaŭdačy katalończaŭ jość taj-, što paŭstańnie rabili socyjalisty z kamunistymi, jakija nia majuć dawieru ŭ narodnych masach, bo narod za imi nie pašoŭ. Ciapier hišpanski ŭrad adbiraje Katalończam i tyja prawy, jakija jany mieli prad hetym — kasuje dasiulešniuju aŭtanomiju.

Šybienica ŭ Baŭharyi dla makiedonskich rewalucyjanieraŭ. Słaŭnyja Makiedoncy zaŭziata zmahajucca za wolu swajho narodu. Z makiedonskimi rewalucyjanerami žorstka raspraŭlajecca baŭharskaja ŭłada. Nadowiačy baŭharskija sudy zasudzili až 12 Makiedoncaŭ na karu śmierci.

Z KRAJU

Sektanstwa. U našym Kraju relihijnych sektaŭ i pieraličyć trudna. Ciapier pajawiłasia jašče nawiejšaja—„nohamyjcaŭ“. Hetaja sekta, jak dawiedwajemsia, maje swaich „wiernych“ kala 1000 asob na Wałyni i na mienš u Wilenščynie.

Z WILNI

Warštaty pracy. U Wilni warštaty pracy ściaž likwidujucca. Upierad likwidawałasia pa 30—40 pradpryjemstwaŭ, a za apošni miesiac začyniłasia 19 warštataŭ pracy.

Biełaruskija

Kalendary

— adryŭnyja i knižkaj —

na 1935 hod

možna najwyhadniej kuplać u

BIEŁARUSKAJ KNIHARNI «PAHONIA» Wilnia Zawalnaja 1.

Cana adryŭnoha kalendara 55 hrašoŭ.

Cana kalendara knižki 65 hr.

Pry bolšych zakupach wialikaja ŭstupka.

Biaz hrošaj kalendary nie wysyłajucca.

Pierasyłka adnaho kalendara 25 hr. na košt zakazčyka.

Пісьмы з вёскі.

Працуйма на карысьць свайго народу!

Задубеньне, Крывіцкай воласьці, Вялейскага пав. Тутэйшы гурток Т.Б.Ш. дня 28.Х. с. г. зладзіў аматарскае тэатральнае беларускае прадстаўленьне. Прадстаўлены былі дзьве камэдыі: „Лекары і лекі“ і „Суд“. Прадстаўленьне ўдалося. Хоць на цеснай сцэне, але артысты-аматары гэтыя штукі адыгралі вельмі ўдачна. Народу было поўная заля, як біткам набіта, з усіх ваколіц, асабліва з вёскі Каранішчы. Моладзь гэнай вёскі заслугоўвае на пашану, там усе нацыянальна сьведамыя і ведаюць, што трэба рабіць беларускай моладзі.

Трэба адцеміць, што і беларуская моладзь падрасла ў розум. Летась было шмат такіх, што рабілі перашкоды беларускаму прадстаўленьню, а сёлета ўсе тыя былі на прадстаўленьні і былі, як людзі.

Я веру, што гэтае пачаткавае зразуменьне дабра будзе пашырацца і паглыбляцца, а гэта давядзе да зразуменьня патрэбы культурна - прасьветнай працы. Веру так-жа, што нашая моладзь гэта зразумеўшы пачне энэргічней працаваць на ніве беларускай сама і сваіх леташніх паступкаў ніколі не паўторыць.

Мы ўсе тут дзеці Беларускага народу, усім нам жывецца кепска. Дык старайможа свой лёс паправіць, каб жыць лепш і палюдзку. Дзеля гэтага нам між сабой сварыцца ня можна і трэба жыць і на агульна-беларускай народнай ніве працаваць дружна. Нам трэба працаваць над сабой; нам трэба чытаць сваю беларускую літаратуру, кніжкі і газэты, якія памагаюць нам выбіцца з цяпрашняга цяжкага нашага палажэньня.

Вам маладзя з Каранішча чэсьць, што ведаеце свае абавязкі і іх выконваеце. Вы зьяўляецеся прыкладам для ваколічнай нашай моладзі.

Праўдзівы.

Хутары.

Дуброва, Маладэчанскага пав. У нас цяпер праводзіцца хутарызацыя. Пакульшто нашыя сяляне з гэтага здаволены. Праўду кажучы, дык хутарызацыя ў нас толькі пачалася — пачалі мерыць зямлю і яе клясыфікаваць. Сяляне чакаюць хутароў і стросяць пляны лепшай гаспадаркі, бо на шнурох ды яшчэ вузенькіх, ня добра гаспадарыць.

У далейшых некаторых ваколічных вёсках ужо праведзена хутарызацыя. Там сяляне з хутароў здаволены. Я. Макар.

Аб нашай коопэратыве.

Шаркаўшчына, Дзісенскага пав. Нядаўна адбылася ў нас рэарганізацыя коопэратывы „Зорка.“ Кіраўнік нашай „Зоркі“ Вярцінскі і Крамнік В. Шышка пашлі ў пастаўку. ТойСамы.

Da našych karespandentaŭ.

SIABRY!

Pišycie ŭ hazetu karespandency wyrazna i čytalna.

Pišycie ab sprawach, jakija majuć charaktar narodny, hramadzki i socyjalny.

Pišycie, nie skaročwajcie słoŭ.

„Bieł Krynica“ karespandentam pasyłajecca biasplatna.

Usim našym karespandentam redakcyja praznačyła na 1935 hod biasplatny i dadatak da hazety,—premiju.

Kožny naš karespandent moža trebawać ad wydawiectwa našaj hazety biasplatnaha i dadatku.

Redakcyja „Bieł. Krynicy“.

—:—

Дзейнаму Сьведку ў Празе. Ліст Ваш атрымалі. Мы нявінны. Вы свой артыкул. „Якая павінна быць нашая палітычная арганізацыя“, прыслалі праз гр. Я. Станкевіча, які быццам па Вашай просьбе перапісаў яго папраўляючы мову. Відавочна ён „паправіў“ і зьмест, бо мы нічога не зьмянялі. Далей шліце проста ў рэдакцыю, тым больш, што Я. С. перадаў артыкул позна і праз другія рукі, так што мы спачатку нават ня ведалі, з кім маем справу.

№2(13). СТУДЭНСКАЯ ТРЫБУНА 9.XII.34.

Цэнтральны Урад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры дня 8-га сьнежня сёл. году арганізуе ў сваей залі (Вільня. Завальная вуліца № 1) акадэмію, у чэсьць сьв. п. праф БРАНІСЛАВА ЭПІМАХ-ШЫПІЛЫ, які памёр дня 6. VI. сёлета ў Ленінградзе.

Праф Эпімах-Шыпіла быў слаўным культурным беларускім дзеячом, адным з піонэраў беларускага адраджэньня. Займаючы пачэсныя і важныя культурныя становішчы і пляцоўкі ў Петраградзе, памагаў чым мог і беларускай студэнскай моладзі, быў, можна сказаць, бацькам гэтай моладзі. Ягонай апекі зазналі Купала, Тарашкевіч, Цішка Гартны, кс. кс. Станкевіч, Гадлеўскі і шмат іншых беларускіх культурных і грамадзкіх дзеячоў.

Заклікаем беларускую студэнскую моладзь ушанаваць памяць праф. Бр. Эпімах-Шыпілы грэміяльным участцем у акадэміі, ладжанай БІГіК. Пачатак акадэміі а гадз. 19. Уваход вольны.

Рэд. Калегія «Ст. Трыбуны».

* * *

Жывём у часе вельмі трывожным. Наступіў крызыс ня толькі эканамічны, але палітычны і маральны. Адбываецца перааацэнка старых вартасьцяў і творацца новыя. Шмат хто ў сувязі з гэтым траціць веру і надзею ў лепшую будучыню, пападаючы ў тупік, у безгранічны пэсымізм.

На сэктары беларускага жыцьця спасьцерагаем шмат і вельмі шмат безнадзейнасьці, апатыі, бязраднасьці. Гэта шкоднае зьявішча. З ім трэба змагацца. Адначасна, ня гледзячы на ўсё, спасьцерагаем і дадатняе зьявішча: наступіў узрост, проста магутны, стыхійны—беларускае нацыянальнае і соцыяльнае сьведамасьці сярод беларускага народу.

Ня сілімся сяньня выказываць прычыны гэтых двух — ад'емнага і дадатняга — зьявішчаў. Скажам толькі, што — згодна з доказамі гісторыі народаў — той, з паасобных людзей і народаў, што ня згубіў веры ў свае сілы, найчасьцей здабываў для сябе дабрабыт і шчасьце.

І мы Беларусы, ідучы крыжовым адраджэнскім шляхам, павінны мець цьвёрдую веру, сілу волі і гарт духа, памятаючы аб тым, што — як кажа наш народны пясьняр Купала, — беларускаю рукою сьветлай праўды сіла славу лепшую напіша Беларусі мілай!

Студэнскія традыцыі.

Студэнства кожнага народу мае свае традыцыі, якія вырабляюцца гадамі, у залежнасьці ад тых варункаў, у якіх жывець народ, з якога данае студэнства паходзіць. Традыцыі — гэта найлепшае сьвядоцтва жыцьця і палажэньня данага народу і данага студэнства. Гэта люстра імкненьняў і ідэалаў маладых запаленых душаў. І гэтак багаты і самаздаволены народ англіцкі стварыў тып студэнта—вялікага дзіцяці, з яго традыцыйнаю гульнёю ў бітвы гнілымі яйкамі і сьнежкамі, робленымі з мукі (у Англіі рэдка бывае сьнег). Зноўжа багаты рыцарскі народ нямецкі (крыжакі і мечаносцы) даў тып студэнта бурсака, з яго традыцыяй вечнага фэхтунку шпадамі, дуэлямі і піцьцём піва, аж „да чорцікаў“.(У нас Беларусаў прабавалі пародыю гэтай традыцыі ўвясьці б. скарынчыкі, але яна не прывілася, ня з прычынаў браку рыцарскасьці нашых дамарослых бурсакоў—былых скарынчыкаў,—яны надта добра валадалі шпадамі,—але не прынялася гэтая традыцыя галоўным чынам з прычыны нашай беднасьці, бо „падачкамі“ шмат і доўга не нап'есься, (тымбольш, што і на гэтыя крошкі меў вялікі апэтыт атаман-хвілістар!). Гэтыя галоўныя галіны традыцыяў заходняга студэнства прывіліся амаль не ва ўсіх заходніх краёх, з пэўнымі, разумеецца, спэцыфічнымі зьменамі і дапаўненьнямі. У большай часткі польскага напр. студэнства, апрача навыкаў скоп'яваных з Немцаў, ёсьць яшчэ спэцыфічны свой навык, а гэта традыцыйнае зацікаўленьне гэральдыкай (навукай аб гэрбах). Кожны амаль новаўступаючы паляк-студэнт цэлымі днямі сядзіць над гэтаю дзіўнаю навукаю, шукаець свайго радовага гэрбу, каб потым—знайшоўшы— заказаць сабе г. зв. радовь пярсьцёнак, як-колечы склеціць сабе „двух—этажнае“ прозьвішча і з вышыні глядзець на жыдоў, ну й на другіх „інародцаў.“ Расейскі зноў жа народ стварыў перад вайною тып студэнта змагара, з яго традыцыяй каханьня навукі, справядлівасьці, вольнасьці, свабоды і поступу наагул. У радох перадваеннага расейскага студэнства нарадзілася і нашая студэнская традыцыя, г. зн. каханьня навукі, справядлівасьці, вольнасьці, свабоды і наагул поступу ў найшырэйшым значаньні гэтага слова. Па вайне, ужо тут пад Польшчай, у Заходняй Беларусі, аднавіў гэтую традыцыю Беларускі Студэнскі Саюз. І вось ужо пятнаццаць гадоў мінаець, як гэтая традыцыя здаровою часткаю нашага студэнства практыкуецца і разьвіваецца. Закусы прадстаўнікоў розных дыктатураў і дэспотыяў (ультрачырвоных і чорных, —комікаў і былых скарынчыкаў), каб разьбіць і зруйнаваць гэтую здаровую традыцыю, дагэтуль ня зьдзейсьніліся, не далі ніякіх рэзультатаў. Галоўнае, што не падабаецца гэтым мафіям у традыцыі Беларускага Студэнскага Саюзу, дык гэта высока падняты ім нацыянальны і незалежніцкі сьцяг.

Так! У змаганьні чалавецтва за лепшае заўтра наагул, гэтае заўтра свайго народу павінна стаяць на першым месцы. Бо-ж у самавызначэньні кожнага народу і разьвіцьці ўсіх ягоных багацьцяў і вартасьцяў ляжыць ідэя і сутнасьць поступу наагул, а поступу свайго народу ў асобнасьці. Не падабаецца гэта рожнай масьці нашым сэрвілістам коньюнктурыстам (трэба-ж зарабіць у сваіх паноў на кавалак хлеба!). Вось яны і цкуюць нашае студэнства, абзываючы яго комунізуючым—з чорнага боку („Родны Край“) і фашыстамі—з ультрачырвонага боку (сталая крытыка на вуліцах Вільні) Мы-ж будзем трымацца аднак старой традыцыі, бо ведаем, што яна для нас і нашага народу найбольш адпаведная. Апэлюем толькі на гэтым месцы да нашага старэйшага грамадзянства, каб яно падтрымала нас у нашым цяжкім сяняшнім змаганьні, каб яно больш об'ектыўна падходзіла да нашага студэнскага жыцьця, памагло нам стварыць моцную і здаровую кадру беларускае інтэлігенцыі, якая потым не пазволіла-б жыраваць на беларускім целе рознай масьці — коньюнктурыстам.

Сябра.

Ачысьціць родную мову!

Вось кліч, які падняло першым, нажаль нядаўна, Таварыства Беларусаведы пры У. С. Б. у Вільні і 25.XI. сёлета зарганізавала навуковую зборку, запрашаючы на яе наўперад прадстаўнікоў беларускае прэсы ў Вільні і ўсё віленскае беларускае грамадзянства. Беларускае грамадзянства прыхільна на запросіны адгукнулася і прышоўшы запоўніла VI-ю залю галоўнага будынку ўнівэрсытэту, гдзе адбывалася зборка.

На парадку дня зборкі—колектыўны рэфэрат п. н. „Мова беларускае прэсы ў Вільні.“ Сябры языкаведнае сэкцыі Т-ва—д-р Я. Станкевіч, мгр. Ст. Станкевіч і старшыня Т-ва студ. В. Войтэнка (у заступніцтве студэнта В. Тумаша, што быў на той час хворы)—зрабілі даклады, у каторых узяўшы для прыкладу некаторыя нумары „Хрысьціянскай Думкі,“ „Шляху Моладзі,“ „Б. Крыніцы,“ Роднага Краю, „Новага Шляху“ і цяпер нявыходзячай „Літаратурнай Старонкі, — даказвалі з гледзішча беларускай філёлёгіі няправільнае ўжываньне гэнай прэсай некаторых слоў, цэлых зваротаў і сказаў, а таксама лішняе ўжываньне барбарызмаў.

Пэўнеж, дакладчыкі толькі парадзілі слухачам, што, — каб захаваць чысьціню беларускай мовы, трэба замест хвальшывых, няправільных — ужываць словы чыста беларускія.

А мы ад сябе дадамо, што парады гэных сяброў языкаведнае сэкцыі Т-ва Беларусаведы хай стануцца нормамі беларускай прэсе і ўсяму беларускаму грамадзянству, а так-жа хай знайдуць практычнае выкарыстаньне дзеля дабра самае беларускае мовы.

Т-ву Беларусаведы, асабліва яго языкаведнае сэкцыі, чэсьць за дбайнасьць аб чысьціню беларускае мовы!

* * *

Апошні (дня 30 XI.) з рэфэратаў так званых пятнічных“ —адбываюцца ў пятніцы, пры Б.І.Г.і К.—адбыўся так жа пад знакам дбайнасьці аб чысьціню беларускай мовы.

Студэнт гуманістычнага факультэту У.С.Б. Часлаў Будзька зьвярнуў увагу на патрэбу захаваньня чысьціні беларускай мовы ў так важным і популярным беларускім друку, якім, зьяўляецца беларускі адрыўны календар.

Нягледзячы на тое, што кал. Ч. Будзка даў назоў рэфэрату даволі гумарыстычны (іменна „Аб зуброх, турох і іншых іншасьцях у беларускім календары)—і гэта наводзіла слухачоў на думку, што прэлегэнт з аўтараў і выдаўцоў календара жартуе ці дарогі пытае,—а так-жа нягледзячы на тое, што прэлегэнт ня даў об'ектыўнае ацэны календара, — рэфэрат выпаў з гледзішча філёлёгічнае й граматычнае ацэны карысным.

Ня можна не зьвярнуць увагі на дыскусію, якая адбылася па гэтым рэфэраце. Дыскусія была-б даволі рэчовай, калі-б некаторыя ўчасьнікі не гаварылі зашмат аб асабістых справах, і калі-б не надужываў дыскусіі, скажам, спэц (М. К—цоў), які ня бачачы, як здаецца, дадатніх старон беларускага адраджэньня, падхапляе з гэтага адраджэньня ад'емныя бакі і робіць з іх жахлівыя вывады. Агулам кажучы, гэты „спэц“ свае разважаньні пачынае ад патопу, а канчае няведама на чым, і нягледзячы на некаторыя, няраз рачовыя, мамэнты ў сваёй гутарцы, гэная ягоная гутарка у вялікай частцы прасякнута жоўцю, што дзеіць на слухачоў, асабліва на моладзь, у некаторай меры дэморалізуюча, бо падрывае ў гэтых слухачоў веру, бадзёрасьць і сілу.

Я. Ш.

— Калегу Хвёдару Ільляшэвічу, абсольвэнту гуманістычнага факультэту УСБ, беларускаму поэту і літэратару, цяперашняму вучыцелю Віл. Бел. Гімназіі і Праваслаўнай Сэмінарыі, з прычыны жанімства (шлюб адбыўся пара тыдняў таму назад) выражаем сваё шчырае жаданьне шчасьця асабістага, і буйнай працы на беларускай ніве ў новым пэрыядзе ягонага жыцьця. Многія леты!...

Аб чым трэба помніць.

Кожны сьведамы беларус-студэнт павінен помніць: што ён зьяўляецца парукай лепшай будучыні народу, што ў ім пакладае свае надзеі беларускае грамадзянства, што на яго сумленьні ляжыць векавы доўг—доўг прад народам і гэты доўг павінен быць гэтаму народу сплачаны.

З гэтага вынікае, што беларускі студэнт павінен быць сьведамым сваіх абавязкаў.

Гарачым сэрцам кахаць Беларусь, быць гатовым для Яе волі аддаць свае маладыя сілы, быць вартаю жалезнай сваёй Бацькаўшчыны; родную мову — найбольшы скарб беларуса—мець у пашане і дбаць аб яе чысьціню і красе; — належаць да ідэйных беларускіх арганізацыяў; усюды і ўсім сьмела прызнавацца ў сваей беларускасьці; нясьці іншым і паглыбляць сваю веду і сьведамасьць.

Выш пералічаныя абавязкі павінен ведаць кожны беларускі студэнт.

Аднак апошняя дзейнасьць на грунце Б.С.С. з боку некаторых студэнтаў, ягоных сяброў, нажаль выказала, што гэтыя абавязкі ім няведамы і гэная шкодная дзейнасьць ёсьць вынікам браку сьведамасьці.

Няведама ім патрэба нацыянальнае лучнасьці беларусаў, патрэба тварэньня адналітага фронту дзеля змаганьня з ворагамі беларускага народу, — з ворагамі, якія імкнуцца да зьнішчэньня бел. нацыянальных сіл, да зьнішчэньня фізычнага і духовага беларускага народу.

С. Коўш.

З увагі на Калядныя і Новагодныя сьвяты, каторыя незадоўга наступяць, Рэд.-Калегія „Ст. Трыбуны“ выражае Калежанкам і Калегам пажаданьне радасна і карысна як для народу, так і для сябе гэныя сьвяты правесьці.

Рэдакцыйная Калегія «Студэнскай Трыбуны» ў складзе: А. Дасюкевіч, Я. Малецкі і С. Коўш.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1— 3. Wydawiec A. Šutowič